# *§ 2–0. Прамысловая рэвалюцыя

**НЕАЛІТЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ**
**ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ**
**ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ УРБАНІЗАЦЫЯ**
**ТЭЛЕГРАФ ПАРАВАЯ МАШЫНА**
**ЭЛЕКТРАРУХАВІК ФАБРЫКА**
**ПРАЛЕТАРЫЯТ БУРЖУАЗІЯ**
**МІГРАЦЫЯ**

Сутнасць прамысловай рэвалюцыі

**1. Прамысловая рэвалюцыя: сутнасць і асноўныя этапы.** Прамысловая рэвалюцыя з'яўляецца адной з найвялікшых падзей у сусветнай гісторыі. Яе значэнне часта параўноўваюць са значэннем *неалітычнай рэвалюцыі*, якая прывяла да пераходу ад палявання і збіральніцтва да земляробства і жывёлагадоўлі, рамяства, або ад прысвойвальнай да вытворчай гаспадаркі. Падчас прамысловай рэвалюцыі грамадства перайшло ад ручной працы да машыннай, ад мануфактурнай вытворчасці да фабрычна-заводскай. Працэс пачаўся ў Англіі і паступова пашырыўся на іншыя краіны Еўропы, а пасля і на свет у цэлым. Прамысловая рэвалюцыя суправаджалася зменамі ў розных сферах грамадства.

Этапы прамысловай рэвалюцыі

Да пачатку XX ст. прамысловая рэвалюцыя прайшла тры этапы.

ЭТАПЫ ПРАМЫСЛОВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

**Ранняя прамысловая рэвалюцыя** (другая палова XVIII ст.) → **Пашырэнне прамысловай рэвалюцыі** (першая палова XIX ст.) → **Позняя прамысловая рэвалюцыя** (другая палова XIX — пачатак XX ст.)

## ІНАВАЦЫІ

- укараненне паравой машыны;
- першыя механізаваныя вытворчасці

- пашырэнне выкарыстання паравой энергіі;
- механізацыя тэкстыльнай прамысловасці;
- з'яўленне чыгуначнага транспарту

- электрыфікацыя;
- развіццё сталеліцейнай і нафтавай прамысловасці;
- стварэнне масавай вытворчасці

## АСАБЛІВАСЦІ

- з'яўленне фабрык і заводаў;
- замена ручной працы на машынную

- развіццё фабрычнай вытворчасці;
- павелічэнне вытворчых магутнасцей;
- індустрыялізацыя

- рост маштабаў вытворчасці;
- павелічэнне аўтаматызацыі;
- развіццё глабальнага гандлю;
- з'яўленне фінансавых і прамысловых карпарацый

## НАСТУПСТВЫ

- эканамічны рост і павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва (павелічэнне вытворчасці і зніжэнне кошту тавараў, паляпшэнне ўмоў працы, развіццё адукацыі і медыцыны);
- фарміраванне новых сацыяльных класаў (буржуазія, пралетарыят);
- сацыяльныя і палітычныя рэформы (пашырэнне выбарчых правоў, стварэнне прафсаюзаў, увядзенне сістэм сацыяльнага страхавання);
- тэхналагічны прагрэс і экалагічны крызіс;
- трансфармацыя гарадскога жыцця (рост гарадскога насельніцтва, развіццё гарадской інфраструктуры)

1. Устанавіце прычынна-выніковыя сувязі паміж прамысловай рэвалюцыяй і паказанымі на схеме наступствамі.
2. У чым заключаліся істотныя адрозненні кожнага этапу прамысловай рэвалюцыі?

Укараненне новых тэхналогій

**2. Роля навукі ў развіцці прамысловасці.** Прамысловая рэвалюцыя пачалася з укаранення новых тэхналогій. Сярод найбольш значных вынаходстваў гэтага перыяду варта адзначыць паравую машыну Дж. Уата, рухавік унутранага згарання Ф. І. дэ Рываза і электрарухавік М. Фарадэя.

Паравая машына

Паравая машына **Джэймса Уата** (1765 г.) была першым у свеце механізмам, які паспяхова пераўтвараў цеплавую энергію пары ў механічную энергію. Гэтая тэхналогія зрабілася базавым элементам прамысловай рэвалюцыі.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У 1789 г. шатландскі інжынер і вынаходнік Дж. Уат увёў тэрмін «конская сіла», каб паказаць, працу колькіх коней здольныя замяніць яго паравыя машыны. Сцвярджаецца, што адну з першых машын Уата набыў півавар, каб замяніць ёю каня, які рухаў вадзяную помпу. Згодна з распаўсюджанай легендай, півавар вырашыў змахляваць, абраў самага цягавітага каня і вымусіў яго працаваць на мяжы сіл. Дж. Уат прыняў і нават перавысіў атрыманае піваварам значэнне, і эталонам зрабілася менавіта магутнасць пабудаванай машыны, нягледзячы на тое што рэальная магутнасць, якую выдае конь пры нармальнай працы на працягу доўгага часу, значна меншая (паводле некаторых ацэнак, у паўтара раза).

1. *У якіх галінах выкарыстоўваецца тэрмін «конская сіла» ў наш час?*
2. *Якія яшчэ адзінкі вымярэння магутнасці вы ведаеце?*
3. *Дзе выкарыстоўваюцца тэхналогіі Дж. Уата ў XXI ст.?*



*Дж. Уат.*
*Мастак Г. Ховард.*
*1797 г.*

Рухавік унутранага згарання

Рухавік **Франсуа дэ Рываза** (1807 г.), або рухавік унутранага згарання, уяўляў сабой механізм, у якім згаранне паліва адбывалася ўнутры спецыяльнага цыліндра. Энергія згарання паліва пераўтваралася

ў механічную. Рухавік увесь час удасканальваўся, што прывяло да стварэння аўтамабіляў і іншых механізмаў.

Электрарухавік

Электрарухавік **Майкла Фарадэя** быў першай прыладай, здольнай пераўтвараць электрычную энергію ў механічную работу, што забяспечыла рэвалюцыю ў прамысловасці, на транспарце і ў пабытавай сферы. З цягам часу электрарухавікі зрабіліся асновай электрыфікацыі, механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці.

Змены ў галіне энергетыкі

Масавае выкарыстанне паравых машын прывяло да радыкальных змен у галіне энергетыкі. Першапачаткова ў якасці асноўнай крыніцы энергіі выкарыстоўваўся каменны вугаль. У выніку магутны штуршок атрымала вугальная прамысловасць, якая пачала бурна развівацца ў Заходняй Еўропе ад сярэдзіны XIX ст. Другі энергетычны зрух адбыўся напачатку XX ст. у сувязі з пераходам на выкарыстанне нафты ў якасці яшчэ адной важнай крыніцы энергіі. Навукова-тэхнічныя адкрыцці ў галіне механікі і энергетыкі прывялі да стварэння такіх важных галін прамысловасці, як аўтамабільная і электратэхнічная.

Развіццё транспартнай сістэмы

Прамысловая рэвалюцыя прывяла да інтэнсіўнага развіцця транспартнай сістэмы. У першай палове XIX ст. у Еўропе і ЗША пачалося будаўніцтва чыгунак. З'яўленне новага віду транспарту азначала сапраўдную рэвалюцыю ў перавозцы грузаў і пасажыраў.

Далейшыя тэхналагічныя інавацыі, такія як аўтамабілі і самалёты, зрабілі транспарт больш хуткім, даступным і эфектыўным.

Удасканаленне сродкаў сувязі

Прагрэс у галіне сувязі таксама быў важнай часткай прамысловай рэвалюцыі. Вынаходства тэлеграфа, тэлефона і радыё значна паскорыла абмен інфармацыяй паміж людзьмі. Пракладка трансатлантычнага тэлеграфнага кабеля ў 1860-х гг., які звязаў Амерыку з Еўропай, зрабілася адным з галоўных тэхнічных дасягненняў гэтай эпохі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Першая ў свеце чыгунка агульнага карыстання з паравой цягай была пабудаваная ў Вялікабрытаніі ў 1825 г. Яе даўжыня была 40 км. На 1840 г. працягласць чыгунак у краіне склала 2390 км, а на 1860 г. — 16 826 км.

Аднак грамадская думка часцяком была супраць чыгуначнага будаўніцтва. Англійская прэса 1820-х гг. сцвярджала: «Чыгункі перашкодзяць каровам пасвіцца, куры перастануць несці яйкі, атручанае дымам паветра будзе забіваць птушак, якія праляцяць побач… дамы каля чыгункі пагараць… у выпадку выбуху паравоза будуць разарваныя на кавалкі ўсе пасажыры…».

1. *Як вы лічыце, чаму з'яўленне чыгуначнага транспарту выклікала ў сучаснікаў незадаволенасць? Хто, на вашу думку, мог ініцыяваць такія публікацыі ў прэсе?*
2. *Чаму, нягледзячы на незадаволенасць насельніцтва, працягласць чыгунак у Вялікабрытаніі павялічвалася такімі хуткімі тэмпамі? Хто быў у гэтым зацікаўлены?*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, знайдзіце 5 цікавых фактаў пра чыгункі.*

Развіццё транспарту і сувязі, у сваю чаргу, спрыяла большай інтэграцыі навуковай супольнасці. Вучоныя маглі хутка абменьвацца інфармацыяй і ідэямі, што, безумоўна, садзейнічала навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Многія навукова-тэхнічныя дасягненні (радыё, тэлефон і кінематограф) непасрэдна адбіваліся на ладзе жыцця людзей. У канцы XIX — пачатку XX ст. кінематограф і радыё зрабіліся не толькі новымі крыніцамі інфармацыі, але і забавамі. Першы ў свеце кінатэатр быў адкрыты ў Парыжы ў 1896 г., у 1903 г. — у Японіі. Названыя вынаходствы прывялі да з'яўлення новай індустрыі адпачынку, зрабіліся часткай паўсядзённага жыцця людзей.

**Фарміраванне індустрыі адпачынку**

Маштабныя змены ў энергетыцы, транспарце і сувязі значна змянілі грамадства і зрабілі яго больш глабальным. Прамысловая рэвалюцыя змя-

ніла не толькі характар вытворчасці, але і жыццё кожнага чалавека.

**3. Эканамічны рост Еўропы.** Навукова-тэхнічны прагрэс і стварэнне фабрычна-заводскай прамысловасці забяспечылі краінам Заходняй Еўропы нечуваны эканамічны рост і ваенна-палітычную магутнасць.

**Прамысловая рэвалюцыя ў Англіі**

Вызначце фактары, якія паспрыялі эканамічнаму росту еўрапейскіх краін у XIX ст.

Растлумачце, чаму ў 50–60-я гг. XIX ст. Англію пачалі называць «майстэрняй свету» і «ўладальніцай мораў».

На сярэдзіну XIX ст. у Англіі склаліся найбольш спрыяльныя эканамічныя і палітычныя ўмовы для прадпрымальніцкай дзейнасці. Велізарныя прыбыткі ад эксплуатацыі калоній у Паўночнай Амерыцы і Індыі ўкладваліся ў англійскую эканоміку. Паспяхова развівалася металургічная і вугальная прамысловасць. У 50–60-я гг. XIX ст. Вялікабрытанія дасягнула свайго эканамічнага піку. Палова сусветнай вытворчасці жалеза і вугалю прыпадала на долю гэтай краіны, насельніцтва якой налічвала ўсяго 2 % ад агульнага насельніцтва свету.

**Прамысловая рэвалюцыя ў Бельгіі**

Прамысловая рэвалюцыя ў Бельгіі пачалася ў 1820–1830-я гг. Гэтая невялікая еўрапейская краіна валодала буйны́мі запасамі каменнага вугалю і жалезнай руды, што спрыяла інтэнсіўнаму развіццю сталеліцейнай і хімічнай вытворчасці. У першай палове XIX ст. Бельгія зрабілася лідарам па шчыльнасці чыгуначнага будаўніцтва ў Еўропе.

**Прамысловая рэвалюцыя ў Францыі**

Прамысловы прагрэс у Францыі быў менш імклівы. Развіццё цяжкай прамысловасці ішло з адставаннем, затое тэкстыльная прамысловасць квітнела. У першай палове XIX ст. Францыя зрабілася еўрапейскім лідарам у вытворчасці шаўковых тканін. Развіццё эканомікі зрабілася больш інтэнсіўным у гады Другой імперыі. Здабыча вугалю і вытворчасць сталі за гэты час выраслі ў 3 разы, а колькасць рабочых на заводах падвоілася.

**Прамысловая рэвалюцыя ў Германіі**

Прамысловая рэвалюцыя ў Германіі пачалася ў 1830-я гг. Краіна выйшла на шлях капіталістычнага развіцця пазней, чым Англія і Францыя. Прамы-

словы пераварот у Германіі развіваўся на аснове ўласнага машынабудаўніцтва і інжынерна-тэхнічных дасягненняў. Працэс індустрыялізацыі ў Германіі стрымліваўся феадальнымі парадкамі ў сельскай гаспадарцы і захаваннем цэхаў у прамысловасці. Аднак аб'яднанне краіны ў 1871 г. дало магутны штуршок эканамічнаму развіццю.

Растлумачце, якім чынам згаданыя фактары маглі стрымліваць эканамічнае развіццё Германіі ў першай палове XIX ст.

Прамысловая рэвалюцыя ў розных краінах праходзіла па-рознаму, і хуткасць яе развіцця залежала ад мноства фактараў, у тым ліку ад доступу да рэсурсаў, палітычнай стабільнасці і тэхналагічных дасягненняў.

**4. Індустрыялізацыя і ўрбанізацыя.** Прамысловая рэвалюцыя істотна паўплывала на міграцыйныя працэсы, выклікала ў XIX ст. масавае перамяшчэнне людзей як унутры асобных краін, так і паміж імі.

### Міграцыйныя працэсы

У пошуках заробку і лепшага жыцця ў гарады і прамысловыя цэнтры перамяшчаліся жыхары сельскай мясцовасці. Умовы жыцця ў прамысловых гарадах былі цяжкія, але яны давалі больш магчымасцей для заробку, адукацыі, доступу да аховы здароўя і іншых сацыяльных паслуг у параўнанні з сельскімі раёнамі. Людзі перазджалі ў гарады, каб палепшыць умовы свайго жыцця. Значны рост гарадскога насельніцтва назіраўся ў краінах, у якіх інтэнсіўна праходзіла *індустрыялізацыя*. Гэты працэс быў характэрны амаль для ўсіх еўрапейскіх краін.

Успомніце, як называецца працэс росту колькасці гараджан і ўзмацнення ролі гарадоў у развіцці грамадства.

Успомніце, што такое індустрыялізацыя.

### Стварэнне прамысловых раёнаў

Напрыканцы XIX ст. у гарадах жыло больш за 10 % насельніцтва свету. Імкліва расло насельніцтва такіх гарадоў, як Лондан, Парыж і Берлін, якія ператварыліся ў буйны́я цэнтры прамысловасці, гандлю, культуры і адукацыі. У асобных краінах утвараліся цэлыя прамысловыя раёны. Найбольш вядомыя былі Ланкашыр у Англіі і Рурскі басейн у Германіі.

## ДОЛЯ ГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў КРАІНАХ ЗАХАДУ Ў XIX ст.




1. Як змянілася колькасць гарадскога насельніцтва ў краінах Захаду?
2. У які перыяд назіраўся найбольш імклівы рост гарадскога насельніцтва? Чым гэта тлумачылася?
3. Вызначце станоўчыя і адмоўныя наступствы ўрбанізацыі ў XIX ст.

**Міграцыя за межы Еўропы**

Растлумачце, чаму менавіта прамысловая рэвалюцыя зрабілася прычынай міграцыі насельніцтва з Заходняй Еўропы.

Прамысловае развіццё прывяло да масавай міграцыі насельніцтва за межы Еўропы. ЗША, Аўстралія, Новая Зеландыя, а таксама краіны Паўднёвай Амерыкі зрабіліся папулярнымі напрамкамі для еўрапейскіх мігрантаў, як правіла, выхадцаў з найбяднейшых пластоў насельніцтва. У ЗША, напрыклад, у XIX ст. знайшлі прытулак больш за 30 мільёнаў чалавек, сотні тысяч людзей — у Аўстраліі, Бразіліі і Аргенціне.

Такім чынам, хуткі рост гарадскога насельніцтва ў XIX ст. быў прамым вынікам індустрыялізацыі і развіцця прамысловасці ў еўрапейскіх краінах.

**5. Эканамічныя наступствы прамысловай рэвалюцыі.** Прамысловая рэвалюцыя зрабілася пераломнай падзеяй у гісторыі чалавецтва. Яна змяніла спосабы вытворчасці, формы гаспадарчай арганізацыі і характар сусветнай эканомікі.

**Рост прамысловасці і прадукцыйнасці працы**

Галоўным вынікам прамысловай рэвалюцыі было імклівае павелічэнне вытворчасці. Машынная вытворчасць аказалася значна больш эфектыўная за ручную, што дазволіла ствараць больш тавараў за меншы час. Вядучыя галіны — тэкстыльная, металургічная, машынабудаўнічая — зрабіліся лакаматывамі эканамічнага развіцця. З'яўленне паравых машын, а пасля электрычнасці дало магутны штуршок развіццю фабрык і заводаў.

**Фарміраванне новых галін эканомікі**

Прамысловая рэвалюцыя спарадзіла цэлы шэраг новых галін: вугальную і нафтавую прамысловасць, чыгуначны транспарт, хімічную індустрыю. Гэта стымулявала рост звязаных сфер — банкаўскай справы, страхавання, гандлю. Эканоміка рабілася ўсё больш дыверсіфікаванай і ўзаемазвязанай.

**Урбанізацыя і рынак працы**

Рост фабрычнай вытворчасці выклікаў перамяшчэнне насельніцтва з вёскі ў гарады. Урбанізацыя зрабілася масавай з'явай: гарады імкліва павялічваліся, ператвараліся ў прамысловыя і фінансавыя цэнтры. Разам з тым змяніўся рынак працы: на змену рамяству і дамашняй вытворчасці прыйшла наёмная праца на фабрыках. З'явіўся рабочы клас, які з цягам часу ператварыўся ў важную сацыяльную і палітычную сілу.

**Міжнародны гандаль і рынак капіталу**

Павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці патрабавала пашырэння рынкаў збыту. У выніку значна вырас міжнародны гандаль, а разам з ім — сусветныя эканамічныя сувязі. Еўрапейскія краіны і ЗША імкнуліся экспартаваць тавары і прыцягвалі сыравіну з калоній. Развіццё банкаў і біржавых інстытутаў прывяло да фарміравання сусветнага рынку капіталу.

**Нераўнамернасць развіцця**

Прамысловая рэвалюцыя ўзмацніла адрозненні паміж краінамі. Тыя дзяржавы, што першымі сталі на шлях індустрыялізацыі, атрымалі эканамічную і палітычную перавагу. Адначасова з гэтым рэгіёны, якія засталіся пераважна аграрнымі, былі вымушаныя даганяць. Гэтая нераўнамернасць вы-

ступіла адной з прычын наступных геапалітычных супярэчнасцей.

**6. Сацыяльныя змены і дэмаграфічная рэвалюцыя.** Прамысловая рэвалюцыя выклікала не толькі эканамічныя, але і глыбокія сацыяльныя і дэмаграфічныя пераўтварэнні, якія закранулі ўсе бакі жыцця грамадства.

**Дэмаграфічная рэвалюцыя**

Вызначце фактары, якія паспрыялі пачатку дэмаграфічнай рэвалюцыі.

У XIX — пачатку XX ст. у Еўропе і Паўночнай Амерыцы пачалася дэмаграфічная рэвалюцыя. Яе сутнасць заключалася ў пераходзе ад традыцыйнага тыпу аднаўлення насельніцтва (высокая нараджальнасць і высокая смяротнасць) да сучаснага (зніжэнне смяротнасці пры захаванні высокай нараджальнасці на першым этапе).

**Урбанізацыя**

Адным з найважнейшых сацыяльных наступстваў прамысловай рэвалюцыі зрабілася ўрбанізацыя. Гарады імкліва раслі, ператвараліся ў прамысловыя, гандлёвыя і культурныя цэнтры. Калі напачатку XIX ст. большасць людзей жыла ў вёсках, дык напачатку XX ст. у многіх краінах значная частка насельніцтва ўжо жыла ў гарадах. Урбанізацыя пацягнула за сабой новыя праблемы: перанаселенасць, антысанітарыю, рост злачыннасці.

**Змены ў сацыяльнай структуры**

Прамысловая рэвалюцыя спарадзіла новыя класы: рабочы клас (пралетарыят), заняты на фабрыках і заводах, і буржуазію — уладальнікаў прадпрыемстваў і капіталу, якія ператварыліся ў вядучую эканамічную і палітычную сілу. Гэта выклікала новыя формы сацыяльнай барацьбы: забастоўкі, рабочыя саюзы, сацыялістычныя і рабочыя партыі.

**Новая роля сям'і і жанчын**

Індустрыялізацыя змяніла структуру сям'і: ад вялікай патрыярхальнай — да малой гарадской. Жанчыны ўсё больш актыўна ўцягваліся ў наёмную працу, што паступова змяняла іх становішча ў грамадстве і рыхтавала глебу да барацьбы за раўнапраўе.

**7. Рабочы рух.** Індустрыялізацыя XIX ст. спарадзіла новы сацыяльны клас — рабочых, або пралетарыят. Іх праца на фабрыках і заводах забяспечвала развіццё прамысловасці, але ўмовы жыцця і працы заставаліся надзвычай цяжкімі: рабочы дзень часцяком складаў 12–14 гадзін, заработная плата была нізкая, тэхніка бяспекі адсутнічала, а жанчыны і дзеці працавалі за меншую плату. Гэта выклікала незадаволенасць і барацьбу за паляпшэнне становішча.

**Формы барацьбы рабочых**

Першыя выступленні насілі стыхійны характар. Найбольш вядомы быў рух лудытаў у Англіі (1811–1813 гг.), калі рабочыя разбуралі машыны, бо лічылі іх прычынай беспрацоўя. Пазней барацьба набыла больш арганізаваныя формы.

**Формы барацьбы рабочых**

- **Забастоўкі** — калектыўнае спыненне працы з патрабаваннямі павышэння заробку або скарачэння рабочага дня
- **Стварэнне прафсаюзаў** — аб'яднанняў рабочых для абароны сваіх правоў
- **Утварэнне рабочых партый і ўдзел у палітычным жыцці**
- **Петыцыі і масавыя дэманстрацыі** (напрыклад, рух чартыстаў у Англіі ў 1830–1840-я гг.)

**Дасягненні рабочага руху на сярэдзіну XIX ст.**

- У Англіі **законам 1847 г.** рабочы дзень быў абмежаваны **10 гадзінамі**
- У шэрагу еўрапейскіх краін былі ўведзены фабрычныя **законы, якія абмяжоўвалі працу жанчын і дзяцей**
- У Германіі ў 1880-я гг. з ініцыятывы А. Бісмарка з'явіліся першыя **законы аб сацыяльным страхаванні**: ад няшчасных выпадкаў, хвароб і па старасці

1. Якую з прадстаўленых формаў барацьбы рабочых вы лічыце найбольш дзейснай? Аргументуйце сваю думку.
2. Чаму ўладальнікі прадпрыемстваў вымушаны былі ісці на саступкі пралетарыяту?

**Станаўленне камуністычнай ідэалогіі**

Рабочы рух суправаджаўся развіццём новых ідэй. У 1848 г. Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс апублікавалі *«Маніфест Камуністычнай партыі»*, дзе мэтай барацьбы пралетарыяту абвяшчалася звяржэнне капіталізму і ўсталяванне грамадства роўнасці.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ




**З Маніфеста Камуністычнай партыі (1848 г.)**

Быць капіталістам — значыць займаць у вытворчасці не толькі выключна асабістае, але і грамадскае становішча. Капітал — гэта калектыўны прадукт і можа быць прыведзены ў рух толькі супольнай дзейнасцю многіх членаў грамадства, а ў канчатковым выніку — толькі супольнай дзейнасцю ўсіх членаў грамадства.

Такім чынам, капітал — не асабістая, а грамадская сіла. Значыць, калі капітал будзе ператвораны ў калектыўную ўласнасць, якая належыць усім членам грамадства, дык гэта не будзе ператварэннем асабістай уласнасці ў грамадскую. Зменіцца толькі грамадскі характар уласнасці. Яна страціць свой класавы характар.

1. *Чаму К. Маркс і Ф. Энгельс лічылі капітал калектыўным прадуктам?*
2. *Чаму ператварэнне капіталу ў калектыўную ўласнасць павінна было прывесці да знікнення класавага характару грамадства?*
3. *Якім шляхам капітал мог быць ператвораны ў калектыўную ўласнасць?*

У 1864 г. быў створаны Першы Інтэрнацыянал, а ў 1889 г. — Другі Інтэрнацыянал, што аб'ядналі рабочыя партыі і прафсаюзы розных краін. Напрыканцы XIX ст. амаль ва ўсіх краінах Еўропы актыўна дзейнічалі сацыял-дэмакратычныя партыі.

**8. Прафсаюзны рух.** З развіццём прамысловасці і ростам колькасці наёмных рабочых паўстала неабходнасць арганізаванай абароны інтарэсаў працоўных. Гэтую ролю пачалі выконваць прафсаюзы — аб'яднанні рабочых для калектыўнай абароны правоў, паляпшэння ўмоў працы і заработнай платы.

Зараджэнне і развіццё прафсаюзнага руху

Першыя прафесійныя аб'яднанні рабочых з'явіліся ў Еўропе напачатку XIX ст. У Англіі ўжо ў 1820–1830-я гг. існавалі саюзы ткачоў, кавалёў, будаўнікоў, якія баранілі сваіх сябраў ад самавольства працадаўцаў. Паступова такія арганізацыі ахоплівалі прамысловы сектар, а ў 1871 г. прафсаюзы ў Вялікабрытаніі атрымалі афіцыйнае прызнанне.

Мэты і метады прафсаюзнага руху

Прафсаюзы ставілі перад сабой наступныя мэты: скарачэнне рабочага дня, павышэнне заработнай платы, паляпшэнне ўмоў працы, абарона ад незаконнага звальнення, стварэнне сістэм сацыяльнага страхавання. Для дасягнення гэтых мэт выкарыстоўваліся калектыўныя перамовы з працадаўцамі, забастоўкі і акцыі пратэсту і г. д.

*Прамысловая рэвалюцыя — адна з найвялікшых з'яў сусветнай гісторыі. Яна змяніла аблічча Еўропы, а пасля і ўсяго свету. Рост насельніцтва, урбанізацыя, фарміраванне новых класаў і сацыяльных рухаў змянілі грамадства і зрабіліся прычынай новых сацыяльных супярэчнасцей. Важным фактарам грамадскага і палітычнага жыцця XIX — пачатку XX ст. выступіў рабочы і прафсаюзны рух. Ён дазволіў рабочым бараніць свае правы, уплываў на заканатворчасць і падрыхтаваў глебу для далейшых палітычных пераўтварэнняў.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1820–1830-я гг. — пачатак прамысловай рэвалюцыі ў Бельгіі | 1820-я гг. — будаўніцтва першых фабрык на тэрыторыі Беларусі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. У чым палягае сутнасць прамысловай рэвалюцыі? Назавіце адметныя рысы і асноўныя этапы прамысловай рэвалюцыі.
2. Як змянілася роля навукі ў эпоху прамысловай рэвалюцыі? Якія найважнейшыя навуковыя адкрыцці былі зроблены ў гэты час і як яны паўплывалі на развіццё эканомікі і грамадства?
3. Ахарактарызуйце асаблівасці эканамічнага развіцця краін Заходняй Еўропы. Вылучыце фактары, якія ўплывалі на тэмпы эканамічнага росту гэтых краін.
4. Вызначыце сацыяльна-эканамічныя наступствы прамысловай рэвалюцыі. У чым заключаецца іх супярэчлівасць?
5. Што азначае паняцце «індустрыялізацыя»? Чаму індустрыялізацыя суправаджалася паскораным ростам гарадоў і гарадскога насельніцтва? Якія прычыны і напрамкі міграцыі насельніцтва еўрапейскіх краін у XIX ст.?
6. Якія фактары спрыялі росту рабочага руху ў XIX ст.? Вылучыце асноўныя формы барацьбы пралетарыяту.